№ 1 (143). Вільня, 12 Студзеня 1939 г. Год XI.

Шлях Моладзі



Šlach Moładzi

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

З Новым Годам!..

Пачынаючы працу ў Новым 1939 Годзе, згодна з звычаем, зробім кароткі агляд беларускага жыцьця і тых падзеяў за мінулы год, якія мелі тую ці іншую лучнасьць з беларускай справай.

Жыцьцё беларускае агулам бяручы не стаяла на месцы і міма няспрыяючых варункаў ішло наперад. У некаторых галінах можна сьцьвердзіць вялікі поступ, хоць былі праявы і ад'ёмныя.

Найбольш мілым і дадатнім праявам ёсьць бязумоўна тое, што Беларусы пачалі менш зварочваць увагі на праблемы перабудовы ўсяго сьвету і ўсясьветную рэвалюцыю, а больш цікавіцца тым, што дзеецца ў сваім Краю. Здаровы творчы беларускі нацыяналізм і высокія ідэалы дэмакрацыі вольнасьць, роўнасьць і братэрства што-раз большае знаходзяць сярод Беларусаў зразуменьне і што-раз шырэйшыя захапляюць кругі. Адначасна пашыраецца і паглыбляецца ў народзе нацыянальная сьведамасьць, прывязанасьць да свае мовы, звычаяў і разуменьне патрэбы падтрымліваньня сваіх беларускіх інстытуцыяў, выдавецтваў, ды кожнага беларускага пачынаньня. Без самахвальства можна сказаць, што ахвярнасьць сярод Беларусаў разьвіваецца вельмі памысна.

У жыцьці культурным трэба падчыркнуць вялікія асягненьні ў галіне мастацка-музычнай, а таксама літаратурнай. Беларуская песьня, паэзія здабыла сабе высокую ацэну ў найлепшых знатакоў.

Найнавейшыя прэсавыя паведамленьні прыносяць нам весткі аб ажыўленьні беларускае эміграцыі. Дагэтуль фактычна ў Краю мала мы чулі аб сваіх братох на чужыне, каторыя пакінулі бацькаўшчыну, каб шукаць там хлеба і лягчэйшага жыцьця. Наагул эмігрантаў не дацэнівалі Беларусы. Тымчасам кожны народ аб сваіх эмігрантах памятуе. Бо эмігранты, хоць далёка ад свайго Краю, могуць многа чаго добрага для яго зрабіць. Агульна ведама напрыклад, як многа памагалі Літве ейныя сыны з Амэрыкі, якую вялікую помач маюць украінскія культурна-асьветныя арганізацыі ад сваіх братоў украінцаў на эміграцыі ў Канадзе, Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі і г. д. Прыемна адзначыць, што ажыўленьне беларускае эміграцыі наступіла з ініцыятывы самых беларускіх эмігрантаў, каторыя стараюцца сарганізавацца і дагнаць страчаны час.

Вялікія міжнародныя падзеі 1938 году ў Сярэдняй Эўропе не прайшлі бязсьледна і каля беларускае праблемы. Падзеі гэтыя прычыніліся да таго, што беларуская праблема знайшла свой шырокі водгалас у загранічнай прэсе і становіцца праблемай міжнароднай.

Да ад'ёмных, а нават шкодных праяваў у беларускім жыцьці трэба наўперад залічыць нутраную нязгоду Беларусаў, непатрэбную і шкодную г. зв. «крытыку», ды выцягваньне дробных, часамі чыста асабістых непаразуменьняў ці недацяжкаў на бачыны прэсы і рабеньне з іх «слана», каторы закрывае і шкодзіць агульна-беларускім справам. — Праўда, і тут пачалася ачыстка, наступіла зразуменьне патрэбы аб'яднаньня і ідзе да лепшага, тым ня менш аднак трэба пажадаць, каб з Новым Годам усе дробныя рэчы, непаразуменьні не займалі месца ў скромнай беларускай прэсе і не заміналі ў працы.

Мы, маладое беларускае пакаленьне, стоячы далёка ад вялікае палітыкі, ды агулам ад розных комбінацыяў, мусім і далей зварочваць увагу перадусім на канкрэтную пазытыўную культурна-асьветную і эканамічна-гаспадарскую працу. Гэта ёсьць найважнейшая справа. Асьвета, культура, умелае гаспадараваньне — зьяўляюцца неадлучнымі таварышамі дабрабыту, каторага так патрабуе наш Беларускі Народ. Асьвета і культура прынясуць так-жа Беларусам і нацыянальнае адраджэньне. Гэтым інтарэсам, гэтым найважнейшым беларускім справам будзе служыць і ў 1939 годзе «Шлях Моладзі» і да працы ў гэтым кірунку заклікаем усю беларускую моладзь. — *Усе на беларускую культурна-асьветную і гаспадарскую ніву!..*

Нашым Новагоднім беларускім зычэньнем ёсьць, каб беларуская ніва мела як найбольш шчырых, ахвярных і стойкіх працаўнікоў.

BIEŁARUSKI CHRYŚCIJANSKI RUCH

Vialiki i niaŭtomny pracaŭnik na biełaruskaj adradženskaj nivie Ks. Adam Stankievič biazupynna ŭzbahačvaje litaraturu ab Biełaruskim Narodzie i jahonym imknieńni. Niadaŭna, jak my ŭžo pisali, vyjšła novaja kniha Ks Ad. Stankieviča p. n. „Biełaruski Chryścijanski Ruch," u katoraj Pavažany Aŭtor daje abšyrny ahulny narys biełaruskaha chryścijanskaha adradženska-nacyjanalnaha ruchu. Spatykajem u joj špiaršэ samyja rańnija vytoki i zaradki biełaruskaha narodna-chryścijanskaha ruchu, paśla niearhanizavanyja jašče jaho pačatki, tady arhanizavany ruch hetaha kirunku ŭ Chryścijanskaj Demakratyčnaj Złučnaści i ŭ Biełaruskaj ChryścijanskajDemakracyi i ŭrešcie inšyja hałaŭniejšyja prajavy biełaruskaha narodna-chryścijanskaha ruchu, jakija adbyvalisia paza henymi arhanizacyjami. U pracy hetaj uziaty pradusim pad uvahu prajavy chryścijanskaha ruchu z hledzišča hramadzkaha i palityčnaha i dziakujučy hetamu „Biełaruski Chryścijanski Ruch" źjaŭlajecca knižkaj cennaj nia tolki z punktu hledžańnia navukova - historyčnaha, ale i praktyčnaha.

Dasiul, jak viedajem, asabliva polskija nacyjanalisty, kožnaha Biełarusa nazyvali kamunistam, biełaruski-ž adradženski ruch u ichnich vačach i vusnach pradstaŭlaŭsia niejkaj kamunistyčnaj intryhaj. Voś-ža kniha Ks. Ad. Stankieviča „Biełaruski Chryścijanski Ruch" i ŭvieś jaje cenny materyjał jość najlepšym zapiarečańniem usim henym absurdalnym zakidam.

Biełaruski narod i jahonaja kultura na praciahu doŭhaha svajho historyčnaha raźvićcia była pad upłyvam Chryścijanstva. Sioleta ŭžo minuła 950 hod, jak biełaruskaja nacyjanalnaść i kultura skraplałasia i raźvivałasia ŭ kasulach žyćciadajnaj chryścijanskaj navuki. Chryścijanstva pryjšło ŭ naš Kraj u formie ŭschodniaj, bizantyjskaj, i taki charaktar mieła našaja kultura až da XIV stahodździa, kali Biełaruś z Litvoj tvoračy Vialikaje Kniastva Litoŭskaje, uvajšli ŭ bližejšyja znosiny z Polščaj. Ad henaha času pačali pašyracca ŭ Biełarusi adznaki kultury zachodnie-katalickaj. Kali-ž paśla Lublinskaj Unii (1569 h.) h. zv. vyšejšyja słai biełaruskaha narodu — mahnaty i šlachta — pačali polščycca, nastupiŭ zaniapad biełaruskaj kultury, katory tryvaŭ až da XIX stahodździa. Ale i ŭ časy zaniapadu biełaruskaść trymałasia pieravažna pry chryścijanskich asiarodkach, nia hledziačy na toje, što šmat chto relihiju našaha narodu vykarystyvaŭ dziela jaho asymilacyi. Tak naprykład, vielmi mocna trymałasia biełaruskaść siarod unijackaha duchavienstva, jakoje ŭžyvała biełaruskaje movy pa školach i cerkvach, a tak-ža pisała i vydavała drukam biełaruskija knižki. Miž inšym Vilenskaja unijackaja kanhrehacyja 1636 h. na svajej 15 sesii pastanaviła, kab manachi havaryli kazańni pabiełarusku.

Kali ŭrešcie Biełarusy ŭ XVIII stahoździ razam z vialikaj častkaj Palakoŭ apynulisia pad Rasiejaj i kali lepšyja syny našaha Kraju — pad upłyvam ramantyzmu — zahlybilisia ŭ historyju svaich narodaŭ i paŭstała dumka nacyjanalnaha biełaruskaha adradžeńnia, padtrymlivała jaje pradusim katalickaje duchavienstva.



Ks. Ad. Stankievič

I tak, pieršym, mo' na't padśviedamym, pačynalnikam biełaruskaha nacyjanalnaha adradžeńnia byŭ ks. Mahnušeŭski, katory vyhadavaŭ pieršaha biełaruskaha sialanskaha paeta Paŭluka Bachryma (Pamior Mahnušeŭski 24.XII. 1828 h.) Vydatnymi pačynalnikami biełaruskaha adradžeńnia byli tak-ža a. M. Babroŭski, Ihnat Danilovič, Ihnat Onacevič, Anton Marcinoŭski, Jazep Jaraševič (usie jany syny biel. unijackich śviaščeńnikaŭ), a tak-ža a. Płaton Sasnoŭski. Paźniejšyja biełaruska - polskija ramantyki — Vinceś Ravinski (178?—1842), Jan Čečat (1797—1847), Jan Barščeŭski (1790 — 1851), A. Rypinski, jakija pryčynilisia taksama da pačatku biełaruskaha adradžeńnia, — u sensie ideolohičnym trymalisia chryścijanstva. Chryścijanstva trymalisia i dadatna jaho acaniali pieršy biełaruski dramaturh Vincuk Dunin-Marcinkievič i słaŭny biełaruski paŭstaniec z 1863—64 h. Kastuś Kalinoŭski. Biełarusami katalikami byli paźniejšyja biełaruskija paety: Al. Jelski, Fr. Bahuševič, J. Niasłuchoŭski, Adam Hurynovič, dy viedamy revalucyjaner Ihnat Hryniaviecki. U sensie ideolohičnym nazyvaje Ks. A. Stankievič i „sacyjalistami" i „katalikami" vydatnych biełaruskich adradžencaŭ: Karusia Kahanca († 1918), Ciotku († 1916), Ivana Łuckieviča († 1919), — hałoŭnaha pravadyra „Biełaruskaje Sacyjalistyčnaje Hramady", jakaja pačała dzieić na pačatku XX stahodździa.

Z pajaŭleńniem-ža siarod Biełarusaŭ vyraznaha kirunku narodna-demakratyčna-sacyjalistyčnaha, adnačasna pačaŭ krystalizavacca kirunak hrupy śviedamych nacyjanalna biełaruskich chryścijan-katalikoŭ. Pieršym takim śviedamym katalikom Biełarusam byŭ prafesar Katalickaj Duchoŭnaj Akademii ŭ Pieciarburzie Branisłaŭ Epimach-Šypiła. Jon vyhadavaŭ celuju plejadu śviedamych i stojkich biełaruskich ksiandzoŭ, załažyŭ i padtrymlivaŭ vydaviectva biel. knižak „Zahlanie sonca ŭ naša vakonca" i ahułam pravodziŭ vialikuju rabotu. Apradča Šypiły mnoha pracavaŭ dla biełaruskaha chryścijanskaha ruchu ŭ he-

nym časie biskup-sufrahan Mahileŭskaj Dyecezii S. Danisevič (1836—1913). Pry jahonaj pomačy Šypiła rabiŭ vialikija ŭpływy na studenckuju moładź. Pieršymi haduncami Šypiły byli nastupnyja ksiandzy: Fr. Budźka, Ad. Lisoŭski, Al. Astramovič (Ziaziula), Fr. Hrynkievič, a tak-ža takija bieł. dziejačy i piśmieńniki, jak Kupała, Taraškievič, Žyłunovič (Ciška Hartny), Hryb, Varonka, inž. Dušeŭski, Zajac i šmat inšych. Ksiandzy Biełarusy, budučy paśla na parachvijach i stykajučysia z svaim narodam, budzili jaho i pašyrali ideju nacyjanalnaha adradžeńnia. Ks. Hrynkievič budučy prefektam u Horadni ŭ himnazii załažyŭ navat nielehalny Hurtok Biełaruskaje Moładzi, jaki ładziŭ biełaruskija viečaryny i vydaŭ u 1913 h. svoj časapis „Kołas našaj nivy.“

Žjaŭlalisia Biełarusy i siarod klerykaŭ Vilenskaje Duchoŭnaje Katalickaje Seminaryi, jak: J. Kažarnovič (paśviačany ŭ 1887 h.), K. Burak, Al. Chadyka, H. Chvastacki, J. Siemaškievič, Fr. Ramejka, Uł. Tałočka, V. Rodźka, J. Baroŭka, M. Piatroŭski, J. Rešeć, M. Šałkievič, Fr. Ałaškievič, A. Cikota, A. Aŭhustynovič, N. Karaleŭski, V. Łukša, K. Stepovič, J. Slavecki, J. Dašuta, M. Boryk, J. Leŭkovič, V. Ramanoŭski, J. Daŭkša, V. Šutovič, J. Hermanovič i inšyja. U 1910 h. u Vil. Duch. Semin. prybyŭ aŭtor „Bieł.-Chryścijanskaha Ruchu“ Ad. Stankievič. Byŭ jon užo śviedamym Biełarusam. Majučy-ž hetulki tavaryšaŭ Biełarusaŭ, mnohija z katorych byli mocna spalanizavanymi, Ks. Ad. Stankievič pavioŭ enerhičnuju pracu nad pašyrańniem biełaruskaje śviedamaści i ŭrešcie załažyŭ tam biełaruski hurtok i biełaruskuju biblijateku. Nia spali biełaruskija kleryki i ŭ Duchoŭnaj Akademii ŭ Pieciarburzie. Tam paŭstaŭ u 1912 h. pad apiekaj praf. B. Epimach-Švpiły biełaruski akademicki hurtok, na čale jakoha stajaŭ Ks. L. Chviečka.

Uzrastajučy lik biełaruskich ksiandzoŭ što-raz bolš padmacoŭvaŭ bieł. adradženski ruch. Paŭstała tak-ža patreba vydavać časapis dla Biełarusaŭ katalikoŭ, bo „Naša Niva,“ jakaja paśla drukavałasia tolki hraždankaj i stałasia byccam orhanam „Bieł. Sac. Hramady,“ nie mahła padyjści da Biełarusaŭ katalikoŭ. Za vydaviectva takoha časapisu ŭzialisia biełaruskija kleryki, katoryja vystupili z duch. seminaryi z tych ci inšych pryčyn: B. Pačopka i A. Byčkoŭski. Pačali jany vydavać časapis p. n. „Biełarus.“ Vychodziŭ jon da 1915 h. i vydaŭ niekalki Bieł. knižak. U 1917 h. pačaŭ vychodzić časapis „Krynica,“ jaki paśla ŭ 1925 h. byŭ pierajmienavany ŭ „Biełaruskuju Krynicu“ i vychodziŭ až da 1937 h., pakul nie zakryli jaho ŭłady. Časapis hety praz doŭhi čas vydavaŭ i redahavaŭ Ks. Ad. Stankievič.

Dziejnaść biełaruskich ksiandzoŭ raźvivałasia i biełaruski chryścijanski ruch zdabyvaŭ šyrokija narodnyja masy. Ksiandzy našy havaryli da narodu kazańni pabiełarusku, arhanizavali pry tym roznyja narady, źjezdy, a ŭrešcie pastanavili stvaryć biełaruskuju arhanizacyju „Chryścijanskaja Demakratyčnaja Złučnaść.“ Paŭstała jana ŭ traŭni miesiacy 1917 h. u Pieciarburzie. Zakładčykami jaje byli ksiandzy: dr. F. Abrantovič i L. Chviečka. Z časam „Bieł. Chr. Zł.“ pieraniasłasia ŭ Miensk a paśla ŭ Vilniu i pieratvaryłasia ŭ „Biełaruskuju Chryścijanskuju Demakracyju,“ z jakoje vyvodzicca ciapierašniaje „Biełaruskaje Narodnaje Abjednańnie.“

Dziejnaść „Biełaruskaje Chryścijanskaje Demokracyi“ vielmi šyrokaja, usiebiełaruskaja, achaplała jana nia tolki Kraj, ale i zahranicu. Prahrama BChD była radykalnaja, niezaležnicka-biełaruskaja; BChD imknułasia da ciesnaha supracoŭnictva Biełarusaŭ katalikoŭ z Biełarusami pravasłaŭnymi na hruncie nacyjanalna-biełaruskim. Heta-ž vyklikała niezadavaleńnie vilenskaha arcybiskupa R. Jałbžykoŭskaha, katory zabaraniŭ naležać da BChD i pracevać a navat čytać „B. Krynicu“ biełaruskim ksiandzom a tak-ža ŭsim bieł. katalikom. Jasna, hetamu prykazu padparadkavalisia, bo musili, tolki ksiandzy Biełarusy, a šyrokija masy dalej astalisia nia inšymi dla BChD. Pry arcyb. Jałbžykoŭskim mova biełaruskaja z usich kaściołaŭ była vyviedziena.

Nia ŭsie adnak vyšejšyja katalickija duchoŭniki varoža adnosilisia da biełaruskaha adradženskaha ruchu. Prychilnymi byli da Biełarusaŭ śv. p. Arcybiskup Jury Matulevič, ryski biskup Anton Sprynhovič, arcybiskup Ropp, katory dazvoliŭ usiudy, dzie jość bolšaść Biełarusaŭ, u kaściołach havaryć kazańni pabiełarusku, a navat sučasny Vilenski biskup-sufrahan Michalkievič padtrymlivaŭ u svaim časie biełaruski adradženska-nacyjanalny i chryścijanski ruch.

U sučasny mament, nia hledziačy na niaspryjajučyja abstaviny, biełaruski chryścijanski ruch dalej raźvivajecca. Rastuć novyja kadry biełaruskich chryścijanskich narodnych dziejačoŭ, duchovym baćkam jakich jość słaŭny Aŭtor knihi, jakuju apisvajem, — Ks. Adam Stankievič.

J. N.

* * *

Сягодня лес
глыбока засмучоны,
як быццам скрыўджаны
маўчыць сасьняк,
як быццам боль схіліў бяроз
кароны
і ня шуміць
бунтарны маладняк.

Зялёны мох...
кусты лазы...
заломы,
з лісьцём апаўшы шолах на траве
і нейкі цень
маўклівы, нярухомы,
смугу
на тропы мокрыя кладзе.

У сэрцы ціш...
Ні мук, ні хваляваньня—
лясны спакой душу маю абняў,
як быццам ўсе трывогі і пытаньня
лясны спакой
маўчаньнем разьвязаў.

М. МАШАРА

Дзікева
1938 г

Зіма

Ўсё схавалася вакола,
пад пялёнкай сьнегавой,
дзе ні глянеш: пуста й гола,
адусюль нясе зімой.

Ня відаць травы счарнелай,
што стырчэла на лугох,
бо пакрыта коўдрай белай
разасланай па палёх.

Рэкі болей не хвалююць,
ні бягуць, і замярлі,
а мяцеліцы бушуюць
па замёрзлай, па зямлі.

Вецер болей стаў сярдзіты,
болей з поўначы стаў дуць,
ён з марозам цесна зьліты:
разам гутарку вядуць.

Разам дрэва убіраюць
і як могуць разьдзяюць,
па лясох, палёх гуляюць
разам песенькі пяюць.

АНДРЭЙ СУЧОК

Пазнавайма родны край!

Нядаўна здарылася мне быць у Камянеччыне, г. зн. у паўночнай частцы Берасьцейскага павету з местам Каменяц Літоўскі. Край гэты гарысты і амаль-што зусім бязлесны, хоць з поўначы граніцыцца ён з Белавежскай пушчай. Вёскі тут раскінуты густа. Двароў вельмі мала. Сяляне бадай усе дворныя землі раскупілі яшчэ перад вайною. Ня гледзячы на гэта ў вёсках на гаспадарках цесната і шмат хто прымушаны йсьці шукаць сабе працы і хлеба. Вонкавы выгляд даволі прыгожы. Хаты абшырныя, прыбраныя прыгожымі вышыванымі ручнікамі і дыванамі. Тут і цяпер вышываюць яшчэ кашулі, а калісь вышывалі нават верхнюю вопратку чорнымі ніткамі. Новая меставая мода сюды бадай-што недастаецца. Насельніцтва агулам моцна трымаецца свае традыцыі і свае роднае мовы, каторая мае вельмі прыгожыя асаблівасьці. Варта было-б, каб на іх зьвярнулі ўвагу беларускія языкаведы, тым больш, што народ тут лічыць сябе і пішыцца беларускае нацыянальнасьці.

Моладзь у Камянеччыне энэргічная, гарачая, хоць часта гэта даводзіць да боек, тым больш што ніякіх культурна-асьветных арганізацыяў, ані такой-жа працы няма. Кніжкі і газэты ў роднай мове не дахолзяць. Ёсьць аднак вёскі, як напр. Угляны, дзе моладзь саматужна займаецца самаасьветай і праводзіць нават барацьбу з п'янствам. Вечарынкі адбываюцца ў іх вельмі прыгожа. Моладзь агулам жыве дружна, у згодзе і вядзе сябе культурна.

Сам Каменяц Літ. раскінуўся над рэчкай Лясной на ўзгорках. Над местам, быццам на далані, на ўзгорку красуецца царква. Каля ракі стаіць абаронная башня пабудаваная ў 1246 г. князем Васількавічам. Ад яе разыходзяцца ў падзямельлі аж тры тунэліхады. У сярэдзіне места рынак. Пабудаваны Каменяц бесплянова. Вуліцы вузкія, крывыя, часта з прычыны горкаў моцна пакацістыя і вышэйшыя адна ад другое. Будынкі хоць запушчаныя, але выглядаюць прыгожа.

Аб мінуўшчыне Каменца ёсьць цікавыя дакумэнты і легенды. Адна з іх гаворыць, што ў Каменцы калісь было аж пяць цэркваў. Адна царква, быццам у часе спатканьня караля, завалілася разам з малячымися ў ёй людзьмі ў зямлю і на гэтым месцы кажны год на Вялікдзень чуваць, як звоняць званы.

Хто будзе калі-небудзь на Палесьсі, раджу яму абавязкава адведаць Каменяц Літ.

Ягор Попка

Čytajma i pašyrajma svaje bieł. časapisy!

Da našaha zakliku ŭ spravie miesiaca prapahandy biełaruskaje presy, jaki adbyvajecca ad 15.XII.38 da 15.I.39 dałučyŭsia jašče adzin časapis — „Беларускі Фронт",z rytańniem tolki, čamu imienna miesiac hety adbyvajecca „ad pałaviny miesiaca da pałaviny, a nie cely miesiac napr. studzień?"

Voś-ža dumajem, što čas (ad 15.XII da 15.I) dla prapahandy biełaruskaje presy vybrany vielmi dobra i ŭ im jana pavinna mieć asablivaje nasileńnie kožny hod. U hetym časie adbyvajucca Kaladnija katalickija i pravasłaŭnyja śviaty i ludzi časta adny druhich adviedvajuć, byvajuć u haściach, ci spatykajucca kala cerkvaŭ, kaściołaŭ, abo na rynku robiačy śviatočnyja pakupki, a znača — ad 15.XII da 15.I ludzi najbolš kantaktujucca i najbolš majuć svabodnaha času, katory mohuć i pavinny vykarystyvać dziela prapahandy svaje biełaruskaje presy. U hetym časie jeduć tak-ža na śviatočnyja feryi biełaruskija studenty i mohuć adnačasna zaviaści na viosku prapahandovyja numary bieł. časapisaŭ i majučy volnyja chviliny zaachvočvać ludziej da vypisvańnia henych časapisaŭ i vyjaśniać značeńnie i patrebu pašyrańnia i padtrymlivańnia svaje biełaruskaje presy. Aprača taho padpiščyki najbolš dumajuć ab časapisach, vybirajuć ich i vypisvajuć u kancy i na pačatku kožnaha kalendarnaha hodu. Ad 15 XII. da 15.I. narod naš, sialanie — pieravažna, kali tak možna skazać, najbahaciejšyja i časta hrošy puskajuć nia tolki na rečy niepatrebnyja, ale prosta škodnyja, jak napr. harełka. Tymčasam, kali-b choć častku henych hrašej, što vydajuć u nas ludzi na harełku i ŭ inšych, vypadkach byli skiravanyja na padtrymańnie biełaruskich časapisaŭ, tady-b paŭstali vializarnyja mataryjalnyja mahčymaści dla raźvićcia biełaruskaje presy. I my vierym, što kali heta nastupić, presa biełaruskaja na hetulki zmoža raźvicca, što jaje hołasu buduć słuchać i z im ličycca navat najvialikšyja vorahi Biełarusaŭ.

Tady biełaruskaja presa zmoža mahutna baranić intaresaŭ Biełaruskaha Narodu, adyjhryvać vialikuju kulturnuju rolu, budzie časta j u vialikich abojmach vychodzić, šyroka infarmavać ab usich padziejach, dy nie pazvolić, kab ab Biełarusach i viestki hinuli. —

Dyk usie čytajma, vypisvajma, pašyrajma i akuratnaj padpiskaj padtrymlivajma biełaruskija časapisy!

Vodhuki vysialeńnia biełaruskich dziejačaŭ

Vysialeńnie biełaruskich dziejačaŭ i kulturnikaŭ: Ks. Adama Stankieviča i inž. Adolfa Klimoviča, a tak ža ks. Ul. Tałočki z Vilni vyklikała šyroki vodhuk nia tolki ŭ biełaruskaj presie, ale ŭ presie polskaj, ukrainskaj, litoŭskaj, rasiejskaj, žydoŭskaj i zahraničnaj. Asabliva šyroka ab hetym pisali: „Kurjer Wileński", „Słowo". „Naród", „Ilustrovany Kurjer Codzienny" i „Goniec Warszawski". Charakterna, što hazeta „Naród", orhan vilenskaha O.Z.N., pravadyry jakoha tak hołasna kryčali ab bratnim sužyćci Polskaha Narodu z slavianskimi mienšaściami, vy stupaŭ suproć vysielenych niazvyčajna vostra, ale biespadstaŭna. „IKC", jak zaŭsiody, vyciahvaje niejkija sensacyi i hetym razam šyraka raśpisaŭsia ab niejkaj ukrainska-biełaruskaj kanferencyi, ab katoraj siarod Biełarusaŭ nichto ničoha nia čuŭ. A najśmiašniej, što „Kurjer Wileński" ŭściaž nia moža raźviazać prablemy: jość Biełarusy, ci niama? Ci-ž sapraŭdy hetaje pytańnie redaktaram „Kur. Vil." jość hetak ciažkim dla raźviazańnia? Ci-ž nia viedajuć jany ab słaŭnaj kulturnaj i palityčnaj historyi Biełarusaŭ, u jakoj movie byŭ napisany słaŭny Litoŭski Statut, jak havaryli Jahajły? Ci-ž nia viedajuć jany celaje plejady biełaruskich litarataraŭ, paetaŭ, navukoŭcaŭ, praca i tvorčaść katorych časta znachodzicca na najvyšejšaj eŭrapejskaj stupieni i ŭsio heta ŭ pryhožym biełaruskim litaraturnym jazyku? Dy ŭrešcie, ci ž redaktaram „Kur. Wil." nia viedamy tyja ŭsie pracy navukoŭcaŭ nia tolki biełaruskich, ale polskich i rasiejskich, katoryja daŭno ŭžo śćvierdzili isnavańnie Biełarusaŭ i praročać im śvietłuju budučyniu?—Prosta dziŭna, što „K. W.", jaki choča być pavažnaj hazetaj, drukuje artykuły, katoryja nia vytrymlivajuć nijakaj krytyki.


jn.

ZIMOVY SPORT

U Biełarusaŭ nastaŭleńnie da sportu, kali nie całkom varožaje, dyk niaprychilnaje. Narod, masy sialanskija ŭvažajuć sport pieravažna za niešta čužoje, pustoje i śmiešnaje. Kali adnak pryhledzimsia bližej da biełaruskaha žyćcia, dyk pabačym, što faktyčna Biełarusy, asabliva moładź, sportam daŭno, ad niapamiatnych časoŭ, zajmajucca. Bo-ž ničym inšym, jak tolki sportam treba nazvać hulni moładzi ŭ pikiera, śvinku, pałačku-stukałačku, kačańnie kaciołkaŭ (kačołkaŭ) i h.d. Pieraličanyja i padobnyja im hulni adbyvajucca viasnoj, kali moładź prastuje sabie kości paśla zimovych siedniaŭ. Ale i ŭzimku tak-ža biełaruskaja moładź zajmajecca sportam, jeździačy sankami z horkaŭ, ładziačy kruciołki na lodzie, abo jeździačy na h. zv. kańkoch (łyžvach). Jak bačym, dziakujučy musić niejkim padśviedamym sama-ŭhadavaŭčym i samazachavaŭčym imknieńniam, Biełarusy raźvivali i raźvivajuć sport, tolki što jon nia maje sarhanizavanych formaŭ, tak jak heta jość na zachadzie Eŭropy ci ŭ Amerycy.

Niekalki hod tamu nazad pačali pajaŭlacca ŭ našym Kraju h. zv. narty ci łyžy. Historyja ich davoli cikavaja. Narty pryjšli da nas až z dalokich vakolic Bajkalskaha voziera na Sibiry i horaŭ Ałtaj, dzie byvaje vielmi mnoha śniehu. Adhetul narty byli raspaŭsiudžany ŭ paŭnočnych krainach Eŭropy. I tak, užo byccam u XII stahodździ finlandzkija vajaki ŭ vajennych svaich pachodach karystalisia nartami. Karystalisia i karystajucca ciapier nartami Laponcy, Narvehi, Švedy i inšyja žychary paŭnočnych krajoŭ. U siaredniaj Eŭropie zacikaŭleńnie nartami ŭzrasło ad času, kali słaŭny narvežski padarožnik Nansen karystaŭsia nartami ŭ svajej padarožy na paŭnočny polus. Narty raniej, jasna, vyhladali inačaj, čymsia ciapier. Raniej heta byli zusim prostyja, doŭhija doščački z zahnutymi ŭharu kancami, katoryja pryviazanyja da noh davali mahčymaść padarožnym pa śniezie chadzić i nie zavalvacca, nia hraznuć u vialikich hurbach. Narty, a panarvežsku i laponsku „sky", majuć ciapier formu ulepšanuju, na ich ciapier adbyvajucca chutkija pierahonki i daŭžernyja skoki. Nartami karystajucca i novačasnyja armii i z hetul pieravažna znajomiacca z imi tyja Biełarusy, katoryja adbyvali słužbu ŭ vojsku. Narciarski sport ahułam vielmi pryhožy, cikavy i pryjemny, dyk staŭsia jon vielmi papularnym. Ale pakul im zajmacca — treba pamaleńku dobra navučycca jeździć, bo jnačaj možna sabie nohi pałamać, a to j hałavu skrucić. Nad budovaj nartaŭ pracujuć ciapier cełyja majstroŭni, na čale z inžynierami, jakija vybirajuć adpaviedni matarjał, prabujuć jaho macunak i h. d. Amerykancam i francuzam tak padabaŭsia hety sport, što jany vydumali navat štučny śnieh i zabaŭlajucca narciarstvam i letam. Biełaruskaj moładzi taksama treba bližej zacikavicca nartami, tymbolš, što hety sport vielmi karysny dla zdaroŭja i jon moža adciahvać moładź ad inšych horšych navykaŭ, jak ad pjanstva, kartaŭ i razbojaŭ.

Z. B.



Na nartach u hory...

20-я ўгодкі Б. С. С. Р.

1 студзеня 1939 году ў Менску адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 20-тых угодкаў стварэньня Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі. У часе гэтага сьвяткаваньня адбываліся: перагляд чырвонае арміі, сабраньні і мітынгі, на якіх прадстаўнікі савецкае ўлады і камуністычнае партыі хвалілі бесканечна Сталіна і заклікалі разьвіваць патрыятызм, каторы трымаў-бы Беларусаў як найбліжэй да Масквы і Расеі.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка створана была 1.I.1919 г. пасьля ліквідацыі Беларускае Народнае Рэспублікі, якая была абвешчана 25.III.1918. Бальшавікі ліквідуючы Бел. Народную Рэспубліку і творачы сваю Бел. Сав. Рэспубліку, хацелі зьліквідаваць тое беларускае асяродзьдзе, каторае хацела гаварыць з Масквой, як роўны з роўным, а так-жа хацелі аслабіць варожасьць Беларусаў да Расеі. Беларуская Савецкая Сац. Рэспубліка тэорэтычна атрымала даволі шырокія правы. І спачатку правы гэтыя мелі нават значэньне ў жыцьці, бо праводзілася даволі шырокая беларуская культурная, асьветная і гаспадарчая праца. Але ўсё гэта, як паказалі пазьнейшыя падзеі, было роблена дзеля таго, каб як найбольш прыцягнуць у Менск беларускае інтэлігенцыі. Калі-ж гэта бальшавіком удалося, яны распачалі безьміласэрнае змаганьне з усімі праявамі беларускага нацыянальнага жыцьця і жорстка зьністожылі ўвесь перадавы беларускі элемэнт, які апынуўся пад іхняй уладай. Сяньня ўсе правы аб культурнай і нацыянальнай свабодзе, не гаворачы ўжо нават аб свабодзе палітычнай, для Беларусаў у СССР ці ў Беларускай Сав. Сац. Рэспубліцы зьяўляюцца мёртвай літарай. Праводзіцца там на кожным кроку русыфікацыя, а жорсткі тэрор ністожыць кожную беларускую работу. Але перажылі Беларусы дэспотычных маскоўскіх цароў, дачакаліся іхняга банкроцтва і развалу магутнае Расейкае Імпэрыі, дык перажывуць і камуністычна-маскоўскіх дыктатараў. І прыйдзе час, што доля Беларускага Народу палепшыцца!..

Я—к.

BIEŁARUSKAJA CHRONIKA

Revizija ŭ redaktara „Kałośsia". 5 h. m. orhany śledčaje palicyi ŭ Vilni zrabili ŭ pryvatnym pamieškańni redaktara „Kałośsia", hram. mg-ra Jana Šutoviča reviziju. U vyniku revizii zabrana asabistaja karespandencyja red. J. Šutoviča, nikatoryja rukapisy, karespandencyja „Kałośsia" i inšyja rečy, a tak-ža pryvatnaja mašynka da pisańnia. Revizija adbyłasia ŭ niaprysutnaści redaktara.

Kanfiskata „Chryścijanskaj Dumki". 3.I.1939 h. pa zahadu Vilenskaha Haradzkoha Starasty skanfiskavany № 1 biełaruskaha časapisu „Chryścijanskaja Dumka".

Pieraškodziła vysialeńnie. „Chryścijanskaja Dumka", jakaja ŭ 1938 hodzie vychodziła try razy ŭ miesiac, ad pačatku Novaha 1939 Hodu mieła vychodzić što tydzień, h. zn. čatyry razy ŭ miesiac. Z pryčyny adnak vysialeńnia z Vilni vydaŭca i hałoŭnaha supracoŭnika hetaha časapisu ks. Ad. Stankieviča, a tak-ža supracoŭnika inž. Ad. Klimoviča, „Chryścijanskaja Dumka" budzie vychodzić dalej tolki try razy ŭ miesiac, kožnaha 1, 10 i 20. Raz na miesiac pry „Chr. Dumcy" budzie vychodzić dadatak dla biełaruskich dzietak „Zorka".

Nabaženstvy dla Biełarusaŭ katalikoŭ u Vilni. Paśla vysialeńnia z Vilni ks. Adama Stankieviča, katory 18 hadoŭ u kaściele śv. Mikałaja adpraŭlaŭ nabaženstvy i havaryŭ pabiełarusku kazańni dla Biełarusaŭ katalikoŭ, stałasia vielmi palučaj sprava dalejšych nabaženstvaŭ u henym kaściele. Dziela taho robiacca ad paviednija starańni. Pieršuju-ž śv. Imšu paśla Kalad 8.I.1939 h. adpraviŭ dla Biełarusaŭ katalikoŭ ks. praf. Taškunas — Litoviec, za što Biełarusy byli jamu vielmi ŭdziačny. Dalej nabaženstvy buduć adbyvacca kožnuju niadzielu i śviaty a hadz. 10 rana.

Biełaruskija kalendary ŭsiudy možna lehalna pradavać. U niekatorych miascoch Maładečanskaha pavietu palicyja zabaraniała pradavać lehalna vydanyja i prapuščanyja vilenskaj cenzuraj biełaruskija kalendary na 1939 h. Dziela hetaha delehacyja ad biełaruskich kniharniaŭ i vydaŭcoŭ biełaruskich kalendaroŭ chadziła z intervencyjaj u Vilenskaje Vajavodztva. Delehacyju pryniaŭ Načalnik Vajavodzkaha Palityčna-Hramadzkaha Addziełu i zajaviŭ, što zaraz-ža vydaść zahad, kab palicyjnyja ŭłady na pravincyi nie rabili nijakich pieraškodaŭ u pradažy biełaruskich kalendaroŭ vydanych u Vilni.

Kamisaryjat dla biełaruskich spravaŭ u Niamieččynie. „Бел. Фронт" u № 1 siol. padaje viestku, što ad 1.I.1939 h. u Berlinie pry Ministerstvie Zahraničnych Spraŭ Niamieččyny paŭstaŭ kamisaryjat dla biełaruskich spravaŭ u Niamieččynie. Hetaja-ž hazeta padaje, što ŭ Berlinie paŭstaŭ hetaki samy kamisaryjat 1.XII.1938 h. dla spravaŭ ukrainskich.

U kancy „Бел. Фронт" piša, što: „Biełaruskaja sprava byccam stavicca ŭ Niamieččynie naraŭnie z ukrainskaj, vidać na vypadak padziełu Rasiei na paasobnyja nacyjanalnyja dziaržavy".

Tvory A. Hurło pačesku. U № 10 českaha „Slovenskaha Prehladu" z 1931 h. nadrukavana 6 vieršaŭ biełaruskaha paeta Alesia Hurło ŭ pierakładzie na česki jazyk viedamaha českaha paeta F. Ticha'ha. Aprača taho źmieščany ŭ hetym-ža časapisie karotki artykuł ab tvorčaści A. Hurło. Aŭtoram artykułu jość toj-ža paet Fr. Tichy, jaki tvory A. Hurło acaniaje vielmi vysaka.

Biełarusy ŭ Litvie. — „Литовский Вѣстник" z 28.XII.1938 h. piša, što 26.XII.1938 h. u Janavie Biełaruski Narodny Teatr u Litvie ładziŭ biełaruskaje pradstaŭleńnie. Stavili 3-ch aktovuju pjesu Fr. Alechnoviča „Ptuška ščaścia". Ludziej było vielmi mnoha. Paśla pradstaŭleńnia adbylisia tancy.

— Biełaruski Klub u Kaŭnasie — „Biełaruskaja Chatka"— 31.XII. 1938 h ładziŭ uračystaje spatkańnie Novaha 1939 Hodu. U prahramie byli bieł. śpievy, deklamacyi i tancy.

Pamior J. Marazovič. Tolki niadaŭna dajšła da nas sumnaja viestka, što miesiac tamu, u 1938h., pamior viedamy biełaruski publicyst Janka Marazovič, jaki pisaŭ pad mianiuškaj Janka Małanka i ŭ svaim časie redahavaŭ humarystyčny biełaruski časapis u Vilni „Małanka". — Viečnaja pamiać!..

Z pryčyn techničnych apošni numar „Šlachu Moładzi" ŭ 1938h., a tak-ža i hety numar vyjšli z apaźnieńniem. Dalejšyja numary budziem staracca vydavać akuratna dva razy ŭ miesiac: 5-ha i 25-ha.

„Шлях Моладзі" ў 1939 г.

Рэдакцыя „Шляху Моладзі" ўсьцяж усімі сіламі стараецца, каб часапіс наш быў сапраўды багатым і цікавым, каб прыносіў ён добрую духовую страву і аднначасна ў меру магчымасьці інфармаваў аб усім, што дзеецца ў Краі і на цэлым сьвеце, ды ў меру сілаў бараніў інтарэсаў Беларускага Народу. Усё гэта аднак цяжка належна выканаць, тымбольш, што спатыкаем часта і многа такіх нявыгодаў, якія пры найвялікшай ахвоце перамагчы немагчыма.

Вялікай, нявыгодай у працы ёсьць малы размер і абыймо часапісу, а з гэтуль нястача ў ім месца. І гэтай, між іншым, нявыгоды перамагчы дасюлешнімі сваімі сіламі і дасюлешняй падпіскай мы ня зможам. Дзеля гэтага патрэбная яшчэ большая колькасьць акуратных падпішчыкаў, якіх здабываць просім памагаць нам усіх нашых прыяцеляў і тых усіх Беларусаў, якім беларуская справа ёсьць блізкая і дарагая. Калі-ж будзем мець больш акуратных падпішчыкаў, тады „Шлях Моладзі" зможа выходзіць часьцей і ў большым абыйме.

У 1939 г. „Шлях Моладзі" далей будзе выходзіць два разы ў месяц—кожнага: 5 і 25, з месячным бясплатным студэнцкім дадаткам „Шлях Беларускага Студэнта". Дзеля таго-ж, каб хоць крыху больш зьмяшчаць у „Шляху Моладзі" матарыялу, некаторыя інфармацыйныя аддзелы будзем друкаваць пэтытам (меншым друкам). Варункі падпіскі далей астаюцца старыя.

Згодна-ж з уведзеным звычаем, сярод акуратных падпішчыкаў „Шляху Моладзі" ў 1939 г. **будзе разлясавана многа розных цэнных прэміяў,** сярод якіх **будуць беларускія бібліятэчкі, земляробскія, садоўніцкія, а так-жа агародніцкія прылады і іншыя карысныя рэчы.**


Словам, будзем рабіць усё, што толькі зможам, каб „Шлях Моладзі" быў цікавы, карысны і задавольваў падпішчыкаў, каторых просім спаўняць так-жа свае абавязкі акуратна і не задоўжвацца.

Рэд. і Адм. „Шляху Моладзі."

Што было і што будзе?

У сувязі з Новым 1939 Годам людзі робяць агляды падзеяў, што былі ў 1938 годзе, і ставяць сабе пытаньне, што будзе ў 1939 годзе? На гэтае пытаньне стараюцца часта знайсьці адказ нават у розных варажбітоў, хіромантаў і астралёгаў, каторыя адзін перад другім папісываюцца сваімі прадбачаньнямі і таёмнай „ведай.“ Адны з іх кажуць, што 1939 г. будзе годам вялікіх катастрофаў і хваробаў, што ў гэтым годзе згіне Сталін, захварэе Мусоліні, панізіцца аўторытэт Гітлера, вайна-ж будзе ўсьцяж „вісець на валаску“ і г. д. Але пакінем цікавіцца варажбой, якая мае свае пачаткі і канчаткі ў фантазіі розных штукароў. Дзеля цікавасьці варта усё-ж кінуць вокам на стары адыйшоўшы 1938 год, каторы прынёс у Эўропу вялікія зьмены і які зусім правільна называюць годам зьменаў.

У 1938 годзе, якраз у дваццатым годзе пасьля сусьветнае вайны і ўстанаўленьня Вэрсальскім Трактатам граніцаў, наступіла такая зьмена, што фактычна гэны трактат зусім ужо скасаваны і ў Эўропе пачалася новая перабудова пад павадырствам Гітлера, дзякуючы якой перадусім Нямеччына павялічыла свой абшар на 114 тысяч кв. клм. і 10 міліёнаў насельніцтва. Зусім-жа зыйшла з эўрапэйскага кругазору Аўстрыя і вельмі моцна пацярпела Чэхаславаччына, каторая пад кіраўніцтвам новага прэзыдэнта др. Э. Гахі павяла зусім новую палітыку, пакідаючы старых саюзьнікаў у Францыі і Англіі, а шукаючы апоры ў Нямеччыне і ў тых народаў, з якімі жыве, а іменна: Славакаў і Украінцаў, даючы ім правы на самастойнае жыцьцё. Узбагаціліся абшарамі Польскае Гаспадарства і Мадзяршчына, аднак поўнасьцю свае мэты — супольнае польска-мадзярскае граніцы і ліквідацыі Карпацкае Украіны—асягнуць ім не ўдалося. Агулам 1938 год праходзіў у трывогах і пры моцных гарматных водгаласах з Гішпаніі і Далёкага Усходу. Самых толькі самалётаў у Гішпаніі зьбітых было каля тысячы. Як падаюць афіцыяльныя весткі, рэспубліканцы ў 1938 г. зьбілі 562 самалёты ген. Франка. Рэспубліканскіх-жа самалётаў лёгкіх было зьбіта 114, апрача таго шмат было зьбіта так-жа бамбавозаў. На Далёкім Усходзе забіта ў вайне больш 823 тысяч Кітайцаў і каля 50 тысяч Японцаў. Крывава выглядала ў 1938 г. і Палестына, дзе кіпела заўзятая барацьба між Арабамі і Жыдамі і дзе агулам было забітых або цяжка раненых 3720 асоб. Для Жыдоў можна сказаць 1938 г. быў асабліва нешчасьлівы, бо ў гэтым годзе найбольш разьвілася проціўжыдоўская агітацыя і проціўжыдоўскія выступленьні. Мінулы год між іншым адзначыўся ўзростам кірункаў нацыяналістычных і зьмяншэньнем уплываў камуністычных.



Др. Э. Гахі,
прэзыдэнт Чэхіі, Славакіі
і Карпацкай Украіны.

Што прынясе новы 1939 год, цяжка згадаць. У кожным разе можна сьцьвердзіць, што агульнае палажэньне вельмі запутанае. Ня толькі не закончаны войны ў Гішпаніі, на Далёкім Усходзе, але дасюль яшчэ канца іх нават ня відаць. Справа Палестыны і праблема жыдоўская далей астаюцца нявырашанымі.

Да гэтага-ж вырас новы канфлікт італіянска-французскі —за калёніі ў Афрыцы. Шмат каму страху наганяюць і вялікія ўсходнія пляны Гітлера. Адначасна-ж збраеньне ўсіх бадай дзяржаў, якое мела і так вялікія размеры, яшчэ больш павялічаецца. Магутнее так-жа кліч самаазначэньня народаў.

Гэткае больш-менш палажэньне ў сьвеце знайшоў новы 1939 год. Дык, хіба няраз прыйдзецца і сёлета перажываць такія самыя, калі ня больш важныя часіны, як і летась.

Збанюк.

Што чуваць

— 5.І. 1939 г. у Бэрхтэсгадэн у Нямеччыне адбылася 3-хгадзінная **канфэрэнцыя польскага міністра заграічных спраў палк. Бэка з нямецкім канцлерам Гітлерам.** Газэты пішуць, што на канфэрэнцыі гэтай абгаварваліся: справа супольнае польска-мадзярскае граніцы, справа нацыянальнае нямецкае меншасьці на Сьлёнску Заользанскім і адносіны польска-савецкія. Аб чым аднак фактычна была гутарка і якія яе вынікі, шырэйшым кругам ня ведама.

— У сувязі з **італіянскімі дамаганьнямі далучыць да Італіі французкія калёніі ў Афрыцы:** Туніс, Альгер, востраў Корсыку і чыгунку, каторая лучыць Абісынію з местам Джібуті, — французы наладзілі дэманстрацыйную падарожу ў гэныя калёніі і на **Корсыку** прэм'ера свайго ўраду **Дэляд'е.** У часе гэнае падарожы, у каторай прыймалі ўдзел так-жа вышэйшыя камандзеры французкае арміі, усюды адбываліся паходы вайсковых аддзелаў і дэманстрацыі насельніцтва сьціраваныя супроць Італіі. Прэм'ер Дэляд'е прыймаючы гэныя дэманстрацыі падчыркваў, што Францыя ніколі ня згодзіцца ўступіць Італіі сваіх абшараў. Пасьля гэтага італіянскія выступленьні супроць Францыі зьмякчэлі.

— 11.І. **англійскі прэм'ер Чэмбэрлен** і мін. загр. спраў Галіфэкс выехалі ў адведзіны да дыктатара **Італіі** Муссоліня'га. Па дарозе затрымаліся яны ў Парыжы, дзе адбылася нарада з прадстаўнікамі французкага ўраду. Чэмбэрлен у гутарцы з Муссолінім мае быццам зьвярнуць увагу перад усім на справу **Гішпаніі**, дзе вайна ўсьцяж адбываецца з вялікай заядласьцю.

—4.І. **японскі** ўрад пад кіраўніцтвам князя Коноя падаўся ў адстаўку. Пры тым Коноя заявіў: з стыдам мушу прызнацца, што не хапае мне здольнасьці, каб перанесьці ўсе цяжары, якімі абцяжаны цяпер кіраўнік японскага ўраду. Новы ўрад стварыў барон Гіранума. Агулам кажуць, што палажэньне Японіі вельмі цяжкае. Між іншым Амэрыка грозіць Японіі эканамічнай вайной. Тымчасам вайна з Кітаем далей цягнецца і адпор Кітайцаў нічуць не слабее. Апошнімі днямі Кітайцам удалося нават адабраць ад Японцаў некаторыя мясцовасьці.

—5.І. прэзыдэнт **Злучаных Штатаў Паўночнае Амэрыкі** Рузвэльт у амэрыканскім парлямэнце сказаў вялікую прамову, у каторай нядвузначна выказаўся, што ў выпадку вайны Зл. Шт. Амэрыкі стануць **па старане Англіі і Францыі.**

— На зьезьдзе **літоўскіх „таўтінінкаў“** — народнікаў—5.І. старшынёй гэтай партыі выбраны цяперашні прэмер літоўскага ўраду кс. Міронас.

— 6.І. неспадзявана на **граніцы Карпацкае Украіны і Мадзяршчыны** выбухла аружная сутычка, у часе якое зьгінула па абедзьвюх старонах некалькі чалавек. Пасьля змаганьне ўспакоілася і пачаліся перагаворы, у якіх Украінцы запрапанавалі, каб Мадзяры аддалі Карпацкай Украіне м. Мукачэў і Ужгорад, Украінцы-ж аддалі-б Мадзярам 25 вясковых воласьцяў. Мадзяры на гэта не згадзіліся і канфлікт аканчальна яшчэ нявырашаны.

Н.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

З КРАЮ

Моладзь, асаднікі і царква

√ **Дуброва, Маладэчанскі пав.** Моладзь у нашай старонцы ўся бадай беларускае нацыянальнасьці, але ёсьць крыху і „пазнанцаў", г. зн. сыноў і дачок прыезных асаднікаў. Агулам сужыцьцё з імі ўвайшло ўжо ў нармальную больш-менш каляіну. Моладзь і дзеці асаднікаў пераважна добра ўжо гавораць пабеларуску, нават лепей чымся папольску. Сьведамасьць сярод нашае моладзі даволі вялікая, але з прычыны адсутнасьці культурна-асьветных беларускіх арганізацыяў фактычна не знаходзе сабе жарала, у якім магла-б поўнасьцю праявіцца. У часе, калі існавалі Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Таварыства Беларускае Школы, было ў нас роблена аж некалькі спробаў стварыць гурткі іх, але з прычын ад моладзі незалежных не змаглі яны паўстаць і працаваць. П'янства нажаль ня выводзіцца і гэта хвароба вельмі цяжкая да вылячэньня. Дзеля перамогі яе трэба яшчэ многа працы. У царкве чуемся пасвойму, бо сьвяшчэньнік наш пропаведзі гаворыць пабеларуску, але бывае часам прабуе гаварыць ужо і папольску. Трэба сказаць, што беларуская мова ў царкве ёсьць дзейнікам, каторы ня толькі прыцягвае людзей да царквы, але лучыць народ з духавенствам, дзеля таго даволі дзіўна, што праваслаўныя духоўныя ўлады не стараюцца ўводзіць беларускае мовы ўва ўсіх цэрквах нашага краю.

П. Завея

Крамы на вёсцы і іхнія ўплывы

Дзятлава, Наваградзкі пав. Апошнімі гадамі, як грыбы пасьля дажджу, растуць па вёсках крамы (склепы). Зьява гэта ў сэнсе эканамічным мае вялікае значэньне і трэба яе вітаць. Але ўсьлед за добрымі зьявамі ідуць благія, якія дрэнна адбіваюцца наўперад на маладым пакаленьні. Разам з крамамі едзе ў вёску гарэлка, тытун і розныя ласушкі. Моладзь пачынае спачатку ласаваць цукеркі, купляючы іх за крадзеныя часта ад бацькоў грошы, збожа, яйкі і г. д., а пасьля пераходзе да тытуну і гарэлкі, чым атручвае свой малады арганізм і псуець здароўе і скарочваець сабе жыцьцё. Нядаўна між іншым у нашай воласьці быў лекарскі агляд школьнае моладзі, які сьцьвердзіў, што ў некаторых школах больш 80 працэнтаў моладзі мае тыя ці іншыя аб'явы хворасьці. Такія рэчы прымушаюць думаць аб будучыні новага пакаленьня і шукаць выхаду. Вось-жа мне здаецца, што ў першую чаргу грамадзянства павінна зрабіць націск, каб гандляры не прадавалі моладзі ані гарэлкі, ані тытуну, ані нават цукеркаў. Калі-ж гэтага ня будзе, дык трэба ў уладаў дамагацца гэткае афіцыяльнае забароны гандляром.

Сьлёзнавокі

Арганізацыя, якая нічога добрага Беларусам не нясе

Нісьцібава, Ваўкавыскі пав. Частка беларускае моладзі ня маючы ў нас свае беларускае арганізацыі паслухала агітатараў „Звёнзку Млодэй Всі" і запісвалася да яго ў сябры, думаючы, што ўсё-ж „Звёнзэк" гэты будзе праводзіць якую небудзь карысную працу. Але ў хуткім часе пераканаліся мы, што арганізацыя гэтая для Беларусаў нічога добрага не нясе і дзеля таго нікому ня радзім да яе запісвацца і належаць.

Б. сябры «К.М.В.»

Паштовая скрынка

К. Арцыману: Грошы атрымалі, дзякуем. „Шлях Моладзі" высылаем акуратна. Просім дам-гацца на пошце.

Сьлёзнавокаму: Карэспандэнцыю, як бачыце, друкуем і просім пісаць часьцей.

Н. Жальбе: Вершы атрымалі і ў меру магчымасьці будзем друкаваць.

П. Завеі: Карэспандэнцыю друкуем і просім пісаць часьцей. „Калосьсе" кн. 4 яшчэ ня выйшла. Нехапаючы нумар „Шл. М." высылаем паўторна. Прывітаньне!

В. Суляўко: Усё высылаем акуратна і гэтымі днямі падамо скаргу ў Дырэкцыю Пошты. Тыя нумары, якіх не атрымалі, вышлем паўторна.

S. K—m: Vierš słabavaty, a karespandencyja moža vyklikać kanfiskatu, dziela taho nia možam ich nadrukavać. Za pryvitańni i pažadańni ščyraja padziaka.

J. Hrybu: Hrošy atrymali. Ščyra dziakujem.

J. Zahorskamu: Vašaha piśma na žal nia možam pračytać. Prosim pisać vyraźniej.

Р. Сьлез-ку: Просьбу споўнілі. За пашыраньне „Ш. М." шчыра дзякуем. „Хр. Думка выходзіць.

Др. Е.: Два пісьмы атрымалі, дзякуем. „Шлях Моладзі" высылаем. Усім прывітаньне!

А. N. і М. Аб.: Календары будуць высланыя. Мы апрача пісьма ад Вас нічога не атрымалі. З матарыялаў у меру магчымасьці ахвотна будзем карыстаць. Усім прывітаньне.

Адв. Б.: За памяць шчырая падзяка.

М. Най—ку: Календары і „Bieł. Chr. Ruch" высланы. Належнасьць перадана.

М. Х—чу: Прапагандавыя нумары высылаем і чакаем на падпіску.

Na dapamahovy fond biełaruskaj moładzi pry „Śl. Mł."

achviaravali:

Kanstanty Suško 1 zł., S. Macuk 5 zł., ks. J. Siemaškievič 2 zł. 50 hr.

Usim achviaradaŭcam ščyra dziakujem.

Red.

Lon z Vilenščyny ŭ Japonii. Niadaŭna byŭ vysłany z Vilenščyny ŭ Japoniju pieršy transpart lonu. Paśla hetaha pryjšoŭ druhi zakaz na hety samy lon. Vartaść abodvych transpartaŭ abličajuć na 80,000 złotaŭ.

Vyvaz lekarskich ziołak. Vyvaz lekarskich ziołak z našaha kraju zahranicu ŭściaž pavialičvajecca. U m-cy listapadzie 1938 h. ahułam vyviezиena 32,000 klh. na sumu 24,000 złotaŭ. Ziołki henyja vyviezieny ŭ Anhliju, Belhiju, Čechasłavaččynu, Daniju, Estoniju, Francyju, Łatviju, Niamieččynu, Palestynu i Švajcaryju.

Iperyt nia budzie strašnym. Amerykanski praf. Ralf Bullard vydumaŭ takuju cieču, katoraja budzie baranić ad dziejańnia najstrašniejšaha trujučaha hazu —iperytu.

Pamior pravadyr endekaŭ. 2.I.39 pamior pravadyr polskich endekaŭ („Stronictwa Narodowego") R. Dmoŭski. Byŭ jon hałoŭnym tvarcom polsk. nacyjanalizmu.

3 milijony varjataŭ. Amerykanskaje navukovaje tavarystva ŭ Richmond apublikavała statystyku, pavodle jakoje ŭ Zł. Št. Paŭnč. Ameryki jość 3 milijony varjataŭ.

Demanstracyi biezrabotnych z čornaj trunoj. U Anhlii ciapier vielmi časta adbyvajucca demanstracyi biezrabotnych. U časie adnaje demanstracyi biezrabotnyja chacieli zaniaści premjeru Čemberlenu čornuju trunu z nadpisam: „Tut pachavany biezrabotny".

Chto buduje SSSR. U Murmansku zbudavany karabielnyja varštaty dla remontu karabloŭ. U varštatach henych pracuje 8,000 rabotnikaŭ, z jakich 5000 prypadaje na palityčnych viaźniaŭ, a 3,000 na kamsamolcaŭ sasłanych na poŭnač z Savieckaj Biełarusi, Savieckaj Ukrainy, i Kaŭkazu.

„Шлях Моладзі" друкуецца ў Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны ў Вільні (Завальная вул. 1—2) коштам працы: Я. Багдановіча, Я. Найдзюка і А. Шутовіча.

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца № 1—2 (Wilno, Zawalna 1—2).

„ШЛЯХ МОЛАДЗІ" выходзіць два разы ў месяц: 5 і 25. Падпіска на год 2 зл. і 50 гр., на паўгода 1 зл. 50 гр., на 3 мес.—75 гр. Цана аднаго экзэмпляра 15 грошаў. — Заграніцу ўдвая даражэй. — Нумар каштатэкі „przekazu rozrachunkowego" 59.

Wydawca: „Bielpres". Выдавец: „БЕЛПРЭС". Drukarnia Białoruska im. Franciszka Skaryny — Wilno, ul. Zawalna 1 Redaktor: J. Najdziuk. Рэдактар: Я. НАЙДЗЮК.